# *Прамова тав. П. К. Панамарэнка*

### *на сходзе выбаршчыкаў Мінскай сельскай выбарчай акругі 7 сакавіка 1950 года*

Таварышы! Наша Совецкая Радзіма стаіць напярэдадні выбараў у Вярхоўны Совет СССР. У гэтыя перадвыбарныя дні ўсе совецкія людзі з законнай гордасцю і радасцю глядзяць на вынік сваёй барацьбы і работы, адзначаюць дасягнутыя поспехі ў развіцці прамысловасці і сельскай гаспадаркі, навукі і культуры, у справе ўздыму матэрыяльнага добрабыту працоўных.

Совецкія людзі ўсе свае думкі і пачуцці гарачай любві, усе свае лепшыя пажаданні звяртаюць да ўсенароднага кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР, да творца і арганізатара ўсіх перамог, нашага правадыра і настаўніка вялікага Сталіна. **(Бурныя працяглыя апладысменты).**

Чатыры гады назад, у гістарычнай прамове на сходзе выбаршчыкаў Сталінскай выбарчай акругі горада Масквы 9 лютага 1946 года, таварыш Сталін паставіў задачу аднавіць пацярпеўшыя раёны краіны, аднавіць даваенны ўзровень прамысловасці і сельскай гаспадаркі і затым перавысіць гэты ўзровень у больш ці менш значных размерах.

Увесь совецкі народ на чале з комуністычнай партыяй працаваў над выкананнем гэтай вялікай сталінскай праграмы комуністычнага будаўніцтва і дабіўся новага магутнага ўздыму ва ўсіх галінах соцыялістычнай гаспадаркі і культуры.

Валавая прадукцыя совецкай прамысловасці за мінуўшы перыяд пасляваеннай пяцігодкі павялічвалася штогод на 20 і больш процантаў. Валавая прадукцыя ўсёй прамысловасці СССР у 1949 годзе перавысіла вытворчасць даваеннага 1940 года на 41 проц. К канцу мінулага года выпуск валавой прадукцыі прамысловасці перавысіў узровень, устаноўлены пяцігадовым планам на 1950 год.

Соцыялістычная сельская гаспадарка ва ўмовах пасляваеннага развіцця зноў паказала сваю вялікую жыццёвую сілу. У выніку велізарнай дапамогі совецкага ўрада і дзякуючы самаадданай працы калгаснага сялянства наша сельская гаспадарка паспяхова пераадолела вынікі вайны і няўхільна ідзе ўгару. Валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі ў цэлым перавысіла ў мінулым 1949 годзе ўзровень даваеннага 1940 года, валавы ўраджай зернавых культур склаў 7,6 мільярда пудоў. Ураджайнасць і валавыя зборы бавоўны, ільну, сланечніка і бульбы таксама перавысілі даваенны ўзровень.

Сур'ёзныя поспехі дасягнуты ў аднаўленні і развіцці грамадскай жывёлагадоўлі. Зараз калгасы маюць грамадскай прадуктыўнай жывёлы больш, чым у даваенным 1940 годзе.

На аснове паспяховага аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі ў пасляваенны перыяд, на аснове павышэння прадукцыйнасці працы і зніжэння сабекошту быў забяспечан сістэматычны ўздым матэрыяльнага

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы